Сяргей НОВІКАЎ

Загадчык кафедры гісторыі і беларусазнаўства Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук




# Тайны нямецкіх архіваў

***Федэральны ваенны архіў Германіі ці «Бундэсархіў-мілітэрархіў» сёння адзін з самых буйных цэнтраў, дзе захоўваюцца дакументы рознага паходжання: прускай імперскай арміі і кайзераўскага флоту, рэйхсверу, вермахта і войск СС, войск ГДР і бундэсвера.***

***Інтарэс беларускіх вучоных да гэтай архіўнай установы выкліканы найперш таму, што тут знаходзяцца дакументы шматлікіх ваенных і грамадзянскіх устаноў Трэцяга рэйха, маючых непасрэднае дачыненне да гісторыі акупацыі Беларусі 1941—1944 гг.***

***Гэты чорны перыяд знайшоў свой адбітак у розных матэрыялах штабоў, камісарыятаў, міністэрстваў, каманд, груп, камендатур. Нямецкія архівы — скарбніца гістарычных таямніц, якія чакаюць нас.***

## Халодны дождж у гарачую навуковую восень

Не так даўно ў Цэнтры ваенна-гістарычных даследаванняў у Патсдаме мне давялося выступаць са справаздачай як выканаўцу міжнароднага праекта. Сярод удзельнікаў сумеснай працы былі вядучыя гісторыкі Германіі — навуковы дырэктар Цэнтра прафесар Г.-Э. Фолькман, Р.-Д. Мюлер, Б. К'яры, Ю. Умбрайт і іншыя.

Германскіх навукоўцаў сёння вельмі цікавіць рэчаіснасць аднаго з самых складаных перыядаў гісторыі найноўшага часу, прычым без штампаў і клішэ. Заўважым, пошук ісціны ў гэтай краіне стаў магчымым таму, што сапраўдныя даследчыкі заўсёды кіраваліся залатым правілам: навука альбо ёсць, альбо яе няма. Ёсць жа яна тады, калі ў аснове пошукаў ляжыць «яго светласць» факт. Сёння па другой сусветнай вайне ў Германіі выходзяць дзесяткі тоўстых, прыгожых і грунтоўных кніг...

А што назапашана ў беларускіх гісторыкаў? За апошняе дзесяцігоддзе ў Беларусі амаль што не апублікавана фундаментальных прац па гісторыі вайны ці «будзённага жыцця» на акупаванай тэрыторыі. Дзе сумесныя навуковыя даследаванні, чаму застаюцца незапатрабаванымі ці проста ігнаруюцца пласты архіўных дакументаў? Чаму гісторыя даследуецца без уліку найноўшых распрацовак сусветнай навукі? Чаму і праз шэсць дзесяцігоддзяў пасля пачатку трагічных падзей на нашай зямлі застаецца так шмат «белых плям»?

«Халодны дождж» — такія словы пачуў я ад сённяшняга навуковага дырэктара Цэнтра Мюлера, аднаго з выканаўцаў грандыёзнай 10-томнай гісторыі «Германскі рэйх і другая сусветная вайна». Нямецкі прафесар у асабістай размове пажартаваў: калі яго любімы сабака трапляе пад халодны дождж, дык адразу атрэсваецца і бяжыць далей... Я толькі сумна ўсміхнуўся ў адказ — і пайшоў моўчкі працаваць у архіў. Адно засталося незразумелым для мяне: чаму працэдуру халоднага дажджу прыйшлося вытрымаць мне аднаму, а не ўсім нашым ваенным гісторыкам?

## Чырвоны аловак

Тэрыторыя Беларусі адной з першых трапіла ў планы падрыхтоўкі ваеннай аперацыі «Барбароса», і таму згадваецца задоўга да яе пачатку ў розных дакументах галоўнага камандавання вермахта. Дакладную карціну дзейнасці нямецкага акупацыйнага рэжыму ў Беларусі малююць шматлікія «Паведамленні пра падзеі» і «Рапарты з занятых усходніх тэрыторый» — дакументы, якія рэгулярна паступалі ў штаб рэйхсфюрэра СС, паліцыі і бяспекі Германіі.

Менавіта ў іх паказаны змрочныя «вынікі» дзейнасці паліцэйскіх фарміраванняў, якія безадмоўна і жорстка выконвалі загады галоўнага начальніка СС і паліцыі на тэрыторыі Расіі-цэнтр і Беларусі з мэтай вынішчэння «ворагаў нацыянал-сацыялізму». Побач з паліцэйскімі фарміраваннямі на акупаванай тэрыторыі дзейнічалі мабільныя спецкаманды ці «Айнзатцгрупы» паліцыі, бяспекі і СД. Кожнае з гэтых падраздзяленняў пакінула шэраг дакументальных матэрыялаў, сярод якіх паведамленні, справаздачы, загады, а таксама журналы баявых дзеянняў, з якіх відаць, як паліцэйскія часткі праводзілі на тэрыторыі Беларусі аперацыі супраць мясцовага насельніцтва, партызанаў, яўрэяў, камуністаў і інш.

Знаёмства з замежнымі архіўнымі фондамі міністэрства Розенберга і генеральнага камісара Кубэ дазваляе прыйсці да цікавага параўнання: амаль удвая больш дакументаў пра дзейнасць міністэрства сёння знаходзіцца не ў Фрайбургу, а ў Маскве, у былым асобым архіве (цяпер гісторыка-дакументальная калекцыя Расійскага дзяржаўнага ваеннага архіва). Калі гаварыць пра архіў генеральнага камісара Кубэ, неабходна адзначыць: у Федэральным архіве Германіі захаваўся толькі 21 дакумент у параўнанні з 3421 адзінкай у нас, у Беларусі.

Адзін з самых закрытых ці малавядомых для айчынных даследчыкаў — фонд 30-й грэнадзёрскай дывізіі войск СС (1-й беларускай), у якім у асноўным сабраны матэрыялы пра гісторыю фарміравання спачатку беларускай брыгады СС, а потым беларускай грэнадзёрскай дывізіі. Гісторыя гэтых фарміраванняў паказана на кароткім адрэзку часу ад 1.01.45 да 20.04.45 г., калі спачатку ствараецца беларускі полк, а з 10 лютага — дывізія. З дакументаў вынікае папярэдняя гісторыя ўзнікнення розных паліцэйскіх фарміраванняў, у тым ліку на тэрыторыі Беларусі: у раёнах Стоўбцаў, Слоніма, Глыбокага, Слуцка, Баранавічаў, Вілейкі, Быценя, Ганцавічаў, Ліды. Адметныя рысы гэтых фарміраванняў можна знайсці ў спецыяльным архіве па асабоваму ўліку ваеннаслужачых вермахта ў Аахене.

Эканамічная палітыка Германіі ў акупаванай Беларусі ў нацысцкай стратэгіі была каланіяльнай эксплуатацыяй разам з людскімі і прыроднымі рэсурсамі. Розныя матэрыялы пра гэта захоўваюцца ў фондзе рэйхсмаршала Герынга — упаўнаважанага па чатырохгадоваму плану; па забеспячэнні ваеннай эканомікі Германіі сыравінай і працоўнымі рэсурсамі; па выкарыстанні прымусовай працы «остэрбайтэраў», жанчын, ваеннапалонных на тэрыторыі рэйха, а таксама па эканамічнай эксплуатацыі занятых усходніх зямель. Звесткі аб эканамічным выкарыстанні ўстановамі і службамі Герынга абшараў Беларусі сустракаюцца ў справаздачах цэнтральнага гандлёвага таварыства «Ост», створанага 17 ліпеня 1941 г. і скіраванага на першачарговае забеспячэнне прадуктамі харчавання патрэб рэйха і яго ўзброеных сіл. У Беларусі гандлёвае таварыства «Ост» мела сваю галоўную кантору ў Барысаве і было адказным за нарыхтоўку зерня, мяса, тлушчу, жывёлы, алею, а таксама за кіраванне сельскагаспадарчай маёмасцю.

Галоўная задача, якая была пастаўлена ўжо 1.09.41 г. вышэйшым кіраўніцтвам, тычылася «забеспячэння войск прадуктамі харчавання з той краіны, на якой яны знаходзяцца». Такі загад ператвараў менавіта Беларусь у галоўны рэгіён, які забяспечваў групу армій «Цэнтр» хлебам, мясам, бульбай, а таксама лесам, прамысловымі вырабамі, рабочай сілай і інш.

Звернемся да дакументаў, пакуль малавядомых айчынным даследчыкам як архіўная крыніца. Вось старонкі гісторыі стварэння эканамічнага штаба Ост, дзейнасць якога прадвызначалася планам ваеннага нападу на СССР і з'яўлялася, такім чынам, неад'емнай функцыяй арганізацыі германскіх узброеных сіл — вермахта.

*«1). Вайна можа доўжыцца толькі тады, калі ўвесь вермахт на трэцім годзе вайны будзе харчавацца з Расіі»* (пераклад аўтара.— *С. Н.*). Аднак пры распрацоўцы плана па выяўленні, уліку і нарыхтоўцы сельскагаспадарчых прадуктаў прадстаўнікі вышэйшага ваеннага кіраўніцтва прапанавалі жудасны план атрымання лішкаў прадуктаў, у якіх бачыў вострую патрэбу нямецкі вермахт у выпадку знаходжання на занятай савецкай тэрыторыі, у тым ліку Беларусі.

Звернемся да другога пункта той праграмы, якая стала вядомай на Нюрнбергскім працэсе, аднак не была прынята ў якасці гістарычнага і навуковага факта. Толькі дзякуючы пошуку даследчыкаў з Германіі — Бернгарду К'яры і Хрысціяну Герлаху — у 90-я гады мінулага стагоддзя гэты дакумент упершыню трапляе ў нямецкі друк.

*«2). Пры гэтым, без сумніву, дзесяткі людзей будуць галадаць, калі неабходнае для нас намі будзе забірацца з краіны».* На практыцы «дзесяткі» сталі мільёнамі ахвяр.

Праграма атрымала свой злачынны працяг у працы *«Харчовая прамысловасць і сельская гаспадарка Беларускай савецкай рэспублікі»,* якая была падрыхтавана ўдзельнікам нямецкай акупацыі Беларусі ў гады першай сусветнай вайны дыпламаваным спецыялістам-лесаводам Е. фон Энгельгартам яшчэ да пачатку ваенных дзеянняў супраць СССР. Энгельгарт — прыбалтыйскі немец, у час першай сусветнай вайны служыў у асобым штабе нямецкіх войск у Мінску і Оршы. З 1944 г. ён быў кіраўніком аддзела лясной гаспадаркі і дрэваапрацоўкі акруговага камісарыята ў Навагрудку. На старонках яго рукапісу і з'явіліся заўвагі, зробленыя чырвоным алоўкам, якія нібыта піша кроплямі чалавечай крыві...

*«sollen sterben!»* «З трох сельскагаспадрачых сямей дзве павінны абавязкова забяспечыць для рэйха пастаўку аднаго работніка (ад 16 да 40 гадоў для кожнага полу), прычым большай часткай у якасці сезонных рабочых, меншай — як кантрактных работнікаў з абавязкам працы ў сельскай гаспадарцы на некальнкі гадоў...»

*«sterben!»* «...гэта тэрыторыя альбо беларуская краіна здолела б пастаўляць у рэйх на год, нават на дзесяцігоддзі амаль 1000000 бездакорных работнікаў для сельскай гаспадаркі, з жаданнем і здольнасцю да любой сельскагаспадарчай працы...»

«Суадносіны паміж гарадскім і сельскім насельніцтвам ва ўсёй БССР на гэты час прыблізна такія:

| | | |
|---|---|---|
| Гарадское насельніцтва | 2 000 000=19,0% | "Verhungern!" |
| Сельскае насельніцтва | 8 600 000=81,0% | "Verhungern zur Halfte!" |
| Усё насельніцтва | 10 600 000=100%» | (пераклад аўтара.— *С. Н.*). |

Нямецкамоўныя словы з клічнікам «sollen sterben», «sterben» і «verhungern», «verhungern zur Halfte» перакладаюцца адназначна: «павінны памерці», «памерці» і «марыць голадам», «напалову замарыць голадам»... Падкрэсліванні былі зроблены, на мой погляд, не аўтарам рукапісу, а, хутчэй за ўсё, распрацоўшчыкамі нацысцкай палітыкі вынішчэння занятых тэрыторый. Такая вось жудасная калькуляцыя! Адзначу, што нямецкамоўныя надпіскі на краях аркуша неразборлівым почыркам вымусілі аўтара гэтых радкоў звярнуцца па дапамогу да супрацоўніц чытальнай залы архіва і бібліятэкі Федэральнага ваеннага архіва ў Фрайбургу. Выказваю ўсім шчырую падзяку за дапамогу.

## «Зялёная папка Герынга»

Другі дакумент, да якога трэба цяпер звярнуцца,— вядомая чытачам так званая «Зялёная папка Герынга». «Дырэктывы для вядзення гаспадаркі на новазанятых усходніх тэрыторыях», падрыхтаваныя і выдадзеныя эканамічным штабам з чэрвеня 1941 да ліпеня 1943... Але і тут не абышлося без купюр. У многіх навуковых выданнях і перыёдыцы па сёння паўтараецца надрукаваны яшчэ ў 1960-я гады пераклад «Зялёнай папкі», дзе ідзе размова пра Беларусь:

*«В Белоруссии будет, вероятно, нелегко в ближайшее время найти руководящий состав, который бы лояльно работал на нас...* (вылучана мной.— *С. Н.*). *С другой стороны, необходимо найти путь использования в наших интересах запасов скота, ячменя, лошадей и древесины и т. д.».* Дык што не патрапіла ў нашым выпадку на старонкі друку? Частка сказа пасля шматкроп'я: *«потому что белорусы в интеллектуальном отношении далеко отстают от живущих там великороссов, евреев и поляков».* Каментарыі тут зусім не патрэбны. У адказ на такую хлусню і пагарду

немцы атрымалі партызанскую вайну і, як вынік Перамогі,— Рэспубліку Беларусь у складзе ААН.

Упершыню «Зялёная папка Герынга» ўзнікае ў невялічкай брашуры А. Лявонцьева ў 1942 годзе. Менавіта ён быў першым, хто паспрабаваў у складаных умовах ваеннага часу навукова апрацаваць матэрыялы, захопленыя Чырвонай Арміяй у якасці трафеяў пры разгроме аднаго з нямецкіх штабоў. Свае ўражанні аўтар выказвае ў прадмове да працы: «ни один будущий историк Великой отечественной (так у тэксце.— *С. Н.*) войны... не сможет пройти мимо этого документа». Але і на сённяшні дзень для большасці навукоўцаў і чытачоў «Зялёная папка» застаецца неапублікаванай у поўным аб'ёме і таму невядомай: няма ні апрацоўкі гэтай крыніцы, ні асэнсавання разам з іншымі зборамі нямецкамоўных матэрыялаў. Гэта цяжка зразумець, калі мець на ўвазе тое, што гэтыя дакументы мелі ключавое значэнне ў каланіяльнай палітыцы нацысцкай Германіі на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

Цэлым мацерыком цікавых і архіважных для навукоўцаў тэкстаў можна назваць «Блакітную папку», пакуль малавядомую для беларускіх даследчыкаў, аднак ахарактарызаваную ў сучасных нямецкіх даследаваннях як «ключавыя дакументы па гісторыі другой сусветнай вайны». Размова ідзе пра 969 архіўных дакументаў эканамічнага штаба Ост, якія знайшлі адлюстраванне ў заключным дакладзе, што пачаў рыхтавацца ў сакавіку 1944 г. спецыяльнай групай ваенных супрацоўнікаў гэтай установы з выкарыстаннем багатага матэрыялу самога штаба, а таксама дзённікаў баявых дзеянняў, дакладаў і справаздач непасрэдна падпарадкаваных яму інспекцый, каманд, груп. Чаму «Блакітная папка» засталася невядомай? На думку доктара Р.-Д. Мюлера, «чысты рукапіс» з'явіўся не раней мяжы 1946/47 года і таму не быў прадстаўлены на Нюрнбергскім працэсе. А гэта ж 1100 старонак каштоўнейшых тэкстаў з дадаткамі і табліцамі!

Сярод новых крыніц — малавядомая айчынным даследчыкам «Карычневая папка», аб якой у савецкіх выданнях можна знайсці толькі некалькі радкоў: матэрыялы яе не былі ніколі цалкам надрукаваны. Калі «Зялёная папка» з'яўлялася цыркулярамі, якімі кіравалася ваенная адміністрацыя на ўсёй тэрыторыі Беларусі, дык частка I «Карычневай» была зборам указанняў для цывільнай адміністрацыі на тэрыторыі рэйхскамісарыята Остланда, у тым ліку ў генеральнай акрузе Беларусь, а частка II — для дзесяці «беларускіх» акруг рэйхскамісарыята Украіна. Як дзейнічалі ўкраінскія ўлады на беларускіх землях у час вайны — няўжо не трэба сёння знаць? Цывільная адміністрацыя была адным з «слупоў» акупацыйнага рэжыму, у ёй удзельнічалі многія мясцовыя калабаранты, дык чаму гэта сёння не цікавіць гістарычную навуку? Можа, па той філасофіі — абы ціха было? Ці адна з прычын — адсутнасць адукацыі, ведання мовы? Але ўзнікае пытанне: чаму не працаваць над сабой — дзеля гонару айчыннай навукі? «У лапцях» сёння навуку наперад не зрушыш.

Рознакаляровыя папкі чакаюць сваіх даследчыкаў. На самай справе іх значна больш — арсенал колераў: нямецкія гісторыкі апрача таго згадваюць «Чырвоную папку», «Жоўтую папку» і іншыя крыніцы, якія знаходзяцца па-за межамі нашай гісторыі. Калі надыдзе іх час — можна толькі здагадвацца.

## «Генеральная акруга»

Якой была палітыка і практыка нямецкага акупацыйнага рэжыму ў прамысловасці? Навуковае адлюстраванне праблемы ў гістарычна-эканамічных працах айчынных і замежных даследчыкаў адрозніваецца. Паводле аднаго з найноўшых беларускіх выданняў, «Эканамічнай гісторыі Беларусі», «у гады вайны на тэрыторыі Беларусі дзейнічала каля 60 адносна буйных прадпрыемстваў (з колькасцю рабочых больш як 30)». Больш за тое, чытача пера-


Richard Lakowski
Seelow 1945
Entscheidungsschlacht
Militärgeschichte
STUDIES IN MILITARY HISTORY
THE WESTERN SECURITY COMMUNITY
Common Problems and Conflicting National Interests during the Foundation Phase of the North Atlantic Alliance
Edited by
NORBERT WIGGERSHAUS & ROLAND G. FOERSTER
Der Zweite Weltkrieg
Analysen · Grundzüge Forschungsbilanz
Im Auftrag des Militärgeschichtlichen Forschungsamtes
H. Boog / W. Rahn / R. Stumpf / B. Wegner
Die Welt im Krieg 1941-1943
Band II
Von El Alamein bis Stalingrad
FORSCHUNGEN ZUR DDR-GESELLSCHAFT
Handbuch der bewaffneten Organe der DDR
Klaus Froh / Rüdiger Wenzke
Ein biographisches Handbuch
ZEITZEUGENFORUM
Der Schatten der Mauer
die zementierte Spaltung
Torsten Diedrich / Rüdiger Wenzke
Die getarnte Armee
Geschichte der Kasernierten Volkspolizei der DDR 1952–1956
Ch. Links
Waffen in Arbeiterhand?
Die Rekrutierung des Offizierkorps der NVA und ihrer Vorläufer
GERMANY AND THE SECOND
VOLUME VI
The Global War
Der Erste Weltkrieg
Wirkung · Wahrnehmung Analyse
Im Auftrag des Militärgeschichtlichen Forschungsamtes
MGFA

конваюць у тым, што «ў рабоце прамысловых прадпрыемстваў Беларусі ў гады акупацыі праяўлялася... паступовае скарачэнне колькасці дзеючых прадпрыемстваў і аб'ёмаў вытворчасці».

Нямецкія навукоўцы прыводзяць сваю статыстыку і геаграфію. Увогуле прамысловай вытворчасцю ў межах дзейнасці эканамічнай інспекцыі «Цэнтр» (тэрытарыяльна яна займала палову Беларусі) было ахоплена ад 40 да 60000 рабочых, якія былі заняты на 500—700 прадпрыемствах, як піша Крысціян Герлах. Крыніцы даюць нямецкім даследчыкам падставы прыйсці да абгрунтаваных высноў аб пашырэні тэхнічнай базы прамысловай вытворчасці ў Беларусі шляхам прывозу і выкарыстання тут абсталявання з занятых расійскіх і ўкраінскіх тэрыторый.

Не будзем гадаць на «кафейнай гушчы», як некаторыя даследчыкі, а звернемся да першакрыніц. Нашы падлікі (аўтар не лічыць іх канчатковымі) зроблены на базе найноўшых дакументаў. Паводле статыстычных звестак акупацыйных эканамічных каманд (Бабруйска, Барысава, Віцебска, Гомеля, Клімавічаў, Лепеля, Магілёва, Оршы, Полацка) па стану на 31.08.42 г. на іх тэрыторыі знаходзіліся 426 прадпрыемстваў, дзе працавалі 40068 рабочых. Менш чым праз год (на 01.05.43 г.) агульная лічба прадпрыемстваў павялічылася да 513, прычым сярод іх з колькасцю ад 20 да 4000 працуючых — 266 фабрык і заводаў: здабываючай, хімічнай, тэкстыльнай і апрацоўчай прамысловасці, торфанарыхтоўкі і дрэваапрацоўкі, шкляных і керамічных вырабаў, энергазабеспячэння. Усяго тут было занята звыш 47000 чалавек. На пачатак верасня 1942 г. самая вялікая колькасць аб'ектаў прамысловасці знаходзілася на тэрыторыі эканамічнай каманды Бабруйск (173, ці 32,3% ад агульнай колькасці). Занятых на іх было яшчэ больш (42,3%). Увогуле ў тылавым раёне групы армій «Цэнтр» асаблівую ролю адыгрывалі на той час эканамічныя каманды Віцебска, Оршы і Бабруйска, у якіх існавалі $^{8}/_{10}$ усіх аб'ектаў і звыш $^{9}/_{10}$ усіх занятых. А на тэрыторыі ўсёй Беларусі, па нашых падліках, на канец 1942 г. працавалі 812 буйных і дробных прамысловых вытворчасцей з амаль 150 тыс. занятых.

А што ў Мінску? Цалкам статыстыка пра стан прамысловасці ў акупаваным горадзе адсутнічае дагэтуль, не знайшла яна свайго адлюстравання нават у новых энцыклапедычных выданнях, напрыклад, у «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» ў 6-ці т. і інш. У такім выпадку зазірнём у германскія навуковыя працы. У найноўшым нямецкім выданні 2000 г. сустракаем: у горадзе на 150 прадпрыемствах у 1943 г. была занята амаль 41 тыс. чалавек. Апрача таго, на ўліку статыстычнай службы гарадскога камісарыята знаходзіліся яшчэ 180 аб'ектаў гандлю, службаў па абслугоўванні вермахта, гарадской управы. Цікава, што нямецкія даследчыкі выкарыстоўваюць для доказаў дакументальныя матэрыялы, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Беларусі (!). Размова ідзе аб пратаколе нарады кіраўнікоў генеральнага і акруговых камісарыятаў у Мінску 8—10 красавіка 1943 г.

Звернем увагу чытача на некалькі дэталяў: важна дакладна ўяўляць структуру прамысловасці горада. У гады акупацыі ў Мінску было 20 металургічных, 14 тэкстыльных і гарбарных прадпрыемстваў, 15 — папяровай і друкарскай прадукцыі, 41 — будаўнічая арганізацыя, 21 — транспартная, 6 — дрэваапрацоўчых, 7 аб'ектаў хіміі і будматэрыялаў, 13 — харчовай прамысловасці, 3 электрастанцыі.

Менавіта такі пералік агучыў старшы ўрадавы інспектар Моас, супрацоўнік гарадской біржы працы, перад кіраўнікамі генеральнай акругі Беларусь. Ён падкрэсліў, што ў прамысловасці горада «працуюць 35 000 чалавек, да гэтага яшчэ 8500 яўрэяў і 3190 ваеннапалонных». Дынаміка ж развіцця была такая: у кастрычніку 1941 г. у акупаваным горадзе дзейнічалі 39 буйных фабрык і заводаў, у пачатку 1942 г.— 77, вясной 1943 г.— 150. Пры гэтым большасць з іх — буй-

ныя прадпрыемствы з колькасцю занятых ад 30 і нават да 5 тысяч чалавек (!). Неабходна адзначыць, што са звестак К. Герлаха менавіта на акупаванай зямлі Беларусі знаходзіліся: «самае буйное прадпрыемства Остланда», «адна з самых буйных вытворчасцей на ўсёй занятай савецкай тэрыторыі», «самае буйное торфаздабываючае прадпрыемства», «буйнейшы дрэваапрацоўчы камбінат».

Ці ведаем мы дакладна гэтыя і іншыя заводы і фабрыкі? Якім чынам стала магчымым такое «развіццё»? Што гэта — вынікі эканамічнай палітыкі нацыстаў ці плён дзейнасці цывільнай адміністрацыі? У выданнях савецкага часу пра гэта пісалася так: *«Хозяйство Белоруссии в период немецко-фашистского оккупационного режима: срыв экономической программы врага»*. Але насамрэч не ўсё было так проста: акупанты ўмелі працаваць, Гітлер планаваў прыйсці на нашу зямлю ўсур'ёз і надоўга, на 1000 гадоў рэйха. І толькі гераізм народа, арміі, партызанаў парушылі гэтыя планы.

## Каляндар разбурэнняў

Нямецкія архівы вялі мяне далей і далей — па дарогах вайны. Так я трапіў у Федэральны архіў у Берліне, у фонд «Генеральнага камісара Беларусі ў Мінску». Хачу пазнаёміць чытача са справаздачай, падрыхтаванай у Данцыгу ў жніўні 1944 г. былым камісарам глыбоцкай акругі Паўлем Гахманам, які апісаў дзейнасць гебітскамісарыята ці так званай «цывільнай адміністрацыі» за перыяд яе існавання — да ліпеня 1944 г. Гэты дакумент часткова ўжо быў надрукаваны ў кнізе «Памяць. Глыбоцкі раён», але купюры былі на рэдкасць вялізнымі і прынцыповымі, агульная карціна падзей таго часу застаецца невядомай для грамадства.

Як ставімся мы да гістарычнай навукі, можна зразумець на параўнанні фрагмента дакумента з арыгіналам нямецкамоўнай першакрыніцы. Возьмем адзін з фактаў, які тычыцца завода па вытворчасці мыла ў Глыбокім. Чытаем у «Памяці»: *«В августе 1943 г. завод был переведен в новое здание на окраине города и оборудован в довольно приличное предприятие, которое насчитывало 15 рабочих, имело 5 котлов и ежемесячно производило 200 кг мыла»*. І, адпаведна, у крыніцы: *«у жніўні 1943 г. у адбудаваным і пашыраным будынку на ўскраіне горада была створана вельмі добрая вытворчасць з усталяваннем 6* (так у крыніцы.— *С. Н.*) *вялікіх катлоў па варцы мыла, дзе працавалі 15 рабочых. Вынікам гэтага было павышэнне месячнай вытворчасці мыла з 200 кг у 1942 г. да 1800 кг у 1943 г. пасля ўвядзення новай фабрыкі»*. Як бачым, айчыннаму чытачу каментарый тут не патрэбны. Можна падумаць, што акупанты акрамя мыла нічым у Беларусі не займаліся і не цягнулі адсюль нічога. Але гэтак не так... Яны рабавалі Беларусь сістэмна.

У справаздачы акруговага камісара П. Гахмана адзначаецца, што па стану на 30 чэрвеня 1944 г. агульная колькасць цывільнай адміністрацыі дасягнула 79 чалавек (выключна нямецкага паходжання), прычым 49 з іх займаліся выкананнем задач толькі аддзела харчавання і сельскагаспадарчай вытворчасці. Піша ён і пра страты (ад нападаў партызанаў) — спакойна акупанты не жылі.

Паколькі гэтыя лічбы не друкаваліся раней, прывядзём статыстыку эканамічнай палітыкі нацыстаў на прыкладзе Глыбоччыны цалкам. Былы камісар глыбоцкай акругі распісвае табліцу з дакладнасцю да адзінак: валёнак — 52154 пары, лямцу — 31257 кг, абмундзіравання (тройка) — 12430 камплектаў, ботаў — 940 пар, чаравікаў — 12 000, матрацаў — 2930 штук, сеннікоў — 22202, коўдраў 15195, падкоўдранікаў — 8114, падгалоўнікаў — 2840, шарсцяных шкарпэтак — 34440, скураных пальчатак — 21729, пуловераў — 12740, шарсцяных коўдраў — 157231, кажухоў — 31820, шарсцяных пальчатак — 63931 пара, навалочак — 2699, ільнянога палатна — 44734 кг, скураных галёшаў — 655 пар, саламяных ботаў — 256 пар, скураных камізэлек — 2109, футравых вусцілак — 10 750

пар, шпітальных тапачак — 3529 пар, толевых пліт — 37280, шчотак — 5311, шкур — 1898, клею — 908 кг, ільнянога алею — 21763 кг, мелу — 4763 кг, мыла — 28499 кг, вупражы — 1010 камплектаў, ільняной макухі — 35695 кг, шарсцяных нітак для цыравання — 189973, напульснікаў — 35066 пар, венікаў — 134800, дзяржанняў для мётлаў — 45219, маскіровачных вяровак — 5000 м, канатаў — 1049 штук, вяровак — 87044 штук, аўчын — 49351, падпруг — 436, падкладачных шкур — 4100, падвоеных ложкаў — 5500, табурэтак — 21000, шафаў — 150, падвод — 3075 штук.

Да ліку агульных паставак вермахта былі далучаны і асобныя віды матэрыялаў, якія захоўваліся ў акруговых сховішчах ці былі сабраны ў час нарыхтоўчых кампаній: цвікі — 1500 кг, фарба — 370 кг, сода — 780 кг, паліва — 435 л, аконнае шкло — 830 кв. м, лямпачкі — 785, лак — 338 кг, рымарскія матэрыялы — 441 кг, металалом (каляровы) — 123220 кг, футры — 63000 штук (48% ад агульнага задання для ўсёй генеральнай акругі Беларусь), драўляныя падводы — 3000.

Гахман прывёў і іншыя цікавыя (аднак абагульненыя) лічбы пра вытворчасць і нарыхтоўку важнейшых відаў сельскагаспадарчай прадукцыі. *1941/42 г.:* збожжа — 7000 тон, мяса — 1500, сена і саломы — 40000 тон. *1942/43 г.:* збожжа — 28000 тон, мяса — 8500, бульбы — 45000, сена і саломы — 150000, птушкі — 20000 штук. *1943/44 г.:* збожжа — 20000 тон, мяса — 8000, сена і саломы — 120000, бульбы — 40000 тон. Апрача гэтага, цывільная адміністрацыя выконвала пастаўкі вермахту масла, тлушчаў, яек, ільнасемя, мёду, рыбы і інш. Прыведзеныя лічбы, на мой погляд, вельмі кантрастна высвечваюць аспекты будзённага жыцця беларускага грамадства, яго супярэчлівую гісторыю ў гады германскай акупацыі.

Рабская праца скончылася з адступленнем захопнікаў. Як гэта было? Нельга прайсці міма не вядомых для нас матэрыялаў. Размова ідзе пра план ліквідацыі важнейшых гаспадарчых аб'ектаў і адміністрацыйных пабудоў у г. Глыбокае, праведзены ў адпаведнасці з загадам камандуючага вермахта ў Беларусі падчас адступлення германскай арміі летам 1944 г.

Звернемся да вытрымкі з «Календара разбурэнняў» камандуючага вермахта ў Беларусі і адзначым, што ў ім згаданы 57 аб'ектаў г. Глыбокае, у большасці свaёй цагляных. Для іх разбурэння спатрэбілася 400 кг узрыўчаткі. Апрача таго, усе гарадскія аб'екты падлягалі спаленню агнём. Выканаўцам гэтага запланаванага разбурэння значылася 660-я палявая камендатура. Пра выкананне гэтага часткова сведчыць і справаздача камісара глыбоцкай акругі П. Гахмана, які скрупулёзна паведамляе пра разбурэнне практычна ўсіх важнейшых аб'ектаў горада ў час эвакуацыі з яго цывільнай адміністрацыі. У гады германскай акупацыі ў горадзе былі: фабрыка па вырабе падвод, завод па выпуску мыла, цэхі і майстэрні па вытворчасці канатаў, вяровак, абутку і інш., а таксама мармеладная фабрыка, 2 млыны (паравы і вадзяны), 7 дубільных майстэрняў, пілярама, 2 малаказаводы, маслабойка, бойня, зернеэлеватар, механічная майстэрня, друкарня, 3 збожжавыя склады і 2 зернетакі, хлебапякарні, завод безалкагольных напіткаў, прадзільная і канатная вытворчасці, халадзільнік і інш. Усё гэта ператварылася ў дым і попел... Беларусь прыйшлося адбудоўваць нанава.

Сёння гісторыя не стаіць на месцы. Яна патрабуе ад навукі сур'ёзнасці. Толькі так можна прыйсці да стварэння рэальнай карціны рэальных трагічных старонак нашага мінулага. Калі не можам пісаць самі, чаму не перакласці тое, што напісана за мяжой?

Пра важнасць нямецкіх даследаванняў для нас сведчаць нават назвы прац, якія ў 1990-я гады сталі на паліцы замежных кнігарняў: *Хартмут Ленгард* — «Жыццёвая прастора на Усходзе. Немцы ў Беларусі. 1941—1944», *Бернгард К'яры* — «Нямецкае грамадзянскае кіраўніцтва ў Беларусі 1941—1944: Работа акруговых камісарыятаў з улікам асобага значэння сельскагаспадарчых кіраўнікоў»,

«Будні па-за фронтам: Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі. 1941—1944»; *Вольфганг Бенц* — «Выкарыстана ў "Рэйхскамісарыяце Остланд": Дакументы па генацыдзе ў краінах Прыбалтыкі і Беларусі. 1941—1944»; *Паўль Коль* — «Вайна германскага вермахта і паліцыі»; *Рольф Міхаэліс* — «СС-Зондэркаманда Дзірлевангер: прыклад германскай акупацыйнай палітыкі ў Беларусі»; *Хрысціян Герлах* — «Скалькуляваныя забойствы: Нямецкая эканамічная палітыка і палітыка вынішчэння ў Беларусі з 1941 па 1944». Дарэчы, гэтая маштабная кніга два гады таму была названа лепшым фундаментальным даследаваннем па гісторыі ў ФРГ.

Архівы тояць яшчэ шмат таямніц складанай і пакуль не даследаванай у поўным аб'ёме гісторыі Беларусі. Вывучэнне нават нязначнай часткі прыведзеных аўтарам першакрыніц пераканаўча сведчыць пра неабходнасць неадкладнага вырашэння новых задач, якія стаяць перад беларускай гістарычнай навукай і датычацца гісторыі асобных рэгіёнаў, гарадоў, вёсак і найперш — людскіх лёсаў.

## КРЫНІЦЫ І ЛІТАРАТУРА

Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945: Энцыклапедыя. Мн., 1990; Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства. Мн., 1999.

Белорусские остербайтеры: историко-аналитическое исследование / Под ред. Г. Д. Кнатько. Мн., 2001; Коваленя А. А. Беларусь 1939—1945 гг.: Война и политика. Мн., 2001; Літвін А. М. Акупацыя Беларусі (1941—1944): пытанні супраціву і калабарацыі. Мн., 2000; Семиряга М. И. Коллаборационизм. Природа, типология и проявления в годы Второй мировой войны. М., 2000.

Lenhard Hartmut. Lebensraum im Osten. Deutsche in Belorussland 1941—1944. Düsseldorf, 1991; Chiari Bernhard. Alltag hinter der Front: Besatzung, Kollaboration und Widerstand in Weissrussland. 1941—1944. Düsseldorf, 1998; Gerlach Christian. Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 2000; Mueller Rolf-Dieter. Verbrechen der Wehrmacht: Dimensionen des Vernichtungskrieges. 1941—1944. Hamburg, 2002.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), ф. 370, воп. 1, спр. 35, 774, 777, 815, 818, 1262, 1263, 1390, 1837; воп. 6, спр. 1.

НАРБ, ф. 412, воп. 1, спр. 113, 189; ф. 510, воп. 1, спр. 65; ф. 652, воп. 1, спр. 2; ф. 4683, воп. 1, спр. 978.

Федэральны ваенны архіў Германіі (BA-MA): RW 31/80, 31/128; 31/130; 31/131; 31/132; 31/133; 31/ 134; 31/262, 31/ 299; 31/862.

Федэральны архіў Германіі (BA): R 90/428.